АРК


# Весці БДПУ

Штоквартальны навукова-метадычны часопіс.
Выдаецца з чэрвеня 1994 г.

**№ 4(54) 2007**

СЕРЫЯ 2.
Гісторыя. Філасофія. Паліталогія. Сацыялогія.
Эканоміка. Культуралогія



*Галоўны рэдактар:*
П. Дз. Кухарчык

*Рэдакцыйная калегія:*
Н. Г. Алоўнікава
А. І. Андарала
(*нам. галоўнага рэдактара*)
У. В. Амелькін
В. А. Бондар
М. К. Буза
В. В. Бушчык
(*нам. галоўнага рэдактара*)
Ю. А. Быкадораў
(*нам. галоўнага рэдактара*)
І. В. Бялько
А. М. Вітчанка
С. Я. Гайдукевіч
К. У. Гаўрылавец
А. А. Груцкі
В. М. Дабранскі
Л. М. Давыдзенка
А. В. Данільчанка
М. М. Забаўскі
В. Б. Кадацкі
Я. Л. Каламінскі
У. М. Калюноў
Л. В. Камлюк
Л. А. Кандыбовіч
І. В. Катляроў
П. В. Кікель
Г. А. Космач
У. М. Котаў
Н. І. Кунгурава
М. В. Лазаковіч
І. Я. Леваш
М. І. Лістапад
А. М. Люты
У. А. Мельнік
І. А. Н...
В. М. ...
А. І. ...
В. Д. ...
В. Б. ...
А. І. ...
І. С. ...
В. М. ...

Весці БДПУ сер2. №4. 2007


## Змест

### *Гісторыя*


*Шаўчук І.І.* Дынаміка колькаснага складу аспірантуры па гуманітарных дысцыплінах (20–30-я гг. XX ст.) ........ 3

*Здановіч У.В.* Падрыхтоўка кадраў вышэйшай кваліфікацыі па гісторыі Беларусі перыяду Вялікай Айчыннай вайны (1990–2005 гг.) ........ 7

*Помазаў С.В.* Сацыяльны і нацыянальны склад навучэнцаў прафесійна-тэхнічных навучальных устаноў БССР у першай палове 1920-х гг. ........ 13

*Мініцкі М.І.* Гістарычныя адукацыйныя веды: роля кагнітыўных практык ........ 18

*Вуглік І.Р.* Сацыяльна-дэмаграфічныя характарыстыкі беларускага сялянства XVIII ст. ........ 22

*Русецкі С.В.* Вывучэнне традыцый дабрачыннасці ва ўсходніх славян у беларускіх, расійскіх і ўкраінскіх даследаваннях XIX – пачатку XXI ст. ........ 25

*Атрушкевіч М.М.* Гільдзейскае заканадаўства ў Беларусі ў 20-я гг. XIX ст. ........ 30

*Лаўрыновіч Д.С.* Віленскія акцябрысты і іх саюзнікі ў пачатку XX ст. ... 33

*Вараб'ёў А.А.* Да пытання аб выніках выбараў ва Устаноўчы сход у Гарадоцкім павеце Віцебскай губерні ........ 37

*Крыварот А.А.* Узаемадзеянне беларускіх і расійскіх партызан (1941–1944): гістарыяграфія за 1941–1965 гг. ........ 40

*Вялікі А.Ф.* Савецка-польскае Пагадненне аб рэпатрыяцыі ад 25 сакавіка 1957 г. як нарматыўна-прававая база рэпатрыяцыі палякаў з БССР у Польшчу ........ 45

*Папоў М.А.* Дапаможныя біскупы Магілёўскага рымска-каталіцкага архібіскупства ў эпоху мітрапаліта Станіслава Богуша-Сестранцэвіча (1773–1826 гг.) ........ 50

*Скарабагатая І.А.* Нацыянал-сацыялістычны рух у Аўстрыі (1920-я гг.) ........ 55


### *Філасофія*


*Кікель П.В., Абалевіч І.В.* Беларускі шлях развіцця: праблемы і перспектывы ........ 60

*Таркан І.І.* Канцэпцыі дыялога культур у рускай філасофскай думцы другой паловы XX ст. ........ 63

*Ігнатовіч А.Л.* Неасакратаўская размова ў кантэксце развіцця кагнітыўнай навукі другога пакалення ........ 66


### *Паліталогія*


*Сіманоўскі І.С.* Метады экстрапаляцыі і параўнальнага аналізу ...народных адносін ........ 69


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# ЭКАНОМІКА

УДК 330.111.62

**Л.М. Давыдзенка,**
*доктар эканамічных навук, прафесар, загадчык кафедры эканамічнай тэорыі і эканамічнага выхавання БДПУ;*
**Міраслава Казлоўска-Бурдзяк,**
*доктар эканамічных навук, дацэнт універсітэта ў Беластоку*

## СІСТЭМА АНАЛІЗУ ПРАВОЎ УЛАСНАСЦІ Ў НОВАЙ ІНСТЫТУЦЫЯНАЛЬНАЙ ЭКАНОМІЦЫ

Уільям Бласконе (англійскі юрыст і палітык) напісаў больш за 200 гадоў таму назад: «Ничто так повсеместно не действует на воображение и не возбуждает эмоций в человеческом роде, как право собственности...» [7, с. 9]. Пытанне ўласнасці непакоіла людзей з даўніх часоў, яно быццам бы спадарожнічала ім заўсёды. Шмат месца праблематыцы ўласнасці прысвячае новая інстытуцыянальная эканоміка.

Класічная і неакласічная палітычная эканомія (так званая артадаксальная эканомія) у сваіх даследаваннях не надаюць належнай увагі праблемам уласнасці, разумеючы іх як нешта знешняе, як некаторыя нязменныя рамкі, у межах якіх здзяйсняюцца працэсы гаспадарання [5, с. 10]. Першай спробай увядзення праблематыкі ўласнасці ў эканоміку, а таксама спробай паставіць пад сумненне асноўныя парадыгмы артадаксальнай эканоміі быў так званы амерыканскі інстытуцыяналізм у асобе Т. Веблена, В. Мітчэла і Дж. Команса. Новая інстытуцыянальная эканоміка (у асобе О. Уільямса, Р. Коўза і Д. Норта) не адмаўляе дасягненняў артадаксальнай эканоміі і спрабуе ўключыць даследаванні эканамічных устаноў у кола зацікаўленасці неакласічнай эканоміі.

М. Іванэк і І. Вількін прылічваюць да новай інстытуцыянальнай эканомікі [5, с. 6]:

– тэорыю правоў уласнасці;
– эканоміку кошту здзелкі;
– тэорыю агенцтва.

О. Уільямс прапанаваў сістэматызаваць эканамічную думку праз класіфікацыйную схему, вызначаючы чатыры ўзроўні тэорыі, якія адрозніваюцца ўзроўнем агульнага характару і гадзінным гарызонтам аналізу [8]:

І узровень (самы агульны) – **нефармальныя інстытуты** (звычаі, традыцыя, рэлігія) – з'яўляецца сферай гісторыкаў і сацыёлагаў па гаспадаранні;

ІІ узровень – **навакольнае інстытуцыянальнае асяроддзе** – гэта значыць фармальныя «правілы гульні» (перш за ўсё ўласнасці) – аб'ект зацікаўленасці эканомікі правоў уласнасці;

ІІІ узровень – **эканоміка кошту здзелкі** – ключавое месца ў аналізе займаюць кантрактныя адносіны, якія злучаюць структуры кіравання са здзелкамі (вядзенне «гульні»);

IV узровень – **неакласічная эканомія і тэорыя агенцтва**, якая ў адносінах да неакласічнай эканоміі носіць дапаўняльны характар.

Другі і трэці ўзроўні з'яўляюцца прадметам даследаванняў новай інстытуцыянальнай эканомікі.

Арыгінальны падыход да праблематыкі ўласнасці можна сустрэць таксама ў тэорыі грамадскага выбару, якая з'яўляецца хутка развіваючайся плынню ў сучаснай эканамічнай тэорыі і ў значнай ступені выкарыстоўвае дасягненні новай інстытуцыянальнай эканомікі.

**Тэорыя правоў уласнасці.** Тэорыя правоў уласнасці з'яўляецца першай сфарміраванай школай новай інстытуцыянальнай эканомікі (property rights theory). Яна ўзнікла ў 60-х гг. мінулага стагоддзя. Першыя працы напісалі А. Алчан, Г. Дземзец, Р. Коўз. У пачатку 70-х гг. з'явіліся працы С. Хенга, С. Пейвіха і Л. дэ Алеса.

Асноўнай даследчай перадумовай тэорыі правоў уласнасці з'яўляецца разуменне правоў уласнасці (грамадска санкцыяніраваныя адносіны паміж людзьмі, якія датычацца выкарыстання рэсурсаў) як правоў канкрэтных фізічных асоб, якія прымаюць рашэнні, звязаныя з уласнасцю незалежна ад фармальных правоў уласнасці [5, с. 84].

Уласнасць у эканамічным сэнсе разумеецца як набор правоў, што належаць уладальніку ў адносінах да прадмета ўласнасці, якім могуць з'яўляцца матэрыяльныя або нематэрыяльныя даброты. Згодна з тэорыяй правоў уласнасці, прадметам абмену з'яўляюцца не столькі даброты, колькі менавіта той набор правоў уласнасці ў адносінах да даброт. Для кожнай асобы пэўныя даброты могуць мець розную каштоўнасць. Гэта будзе залежаць ад таго, што дадзеная асоба можа зрабіць з гэтымі дабротамі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Асноўнае сцвярджэнне тэорыі правоў уласнасці вызначае, што рашаючае значэнне для эфектыўнасці выкарыстання дадзенага рэсурса мае матывацыя асобы, якая ім валодае [5, с. 85]. Затое матывацыя залежыць ад паўнаты правоў уласнасці. У сваю чаргу, на ўзровень паўнаты правоў уласнасці ўплываюць два асноўныя фактары: выключнасць (суверэнітэт уладальніка ў распараджэнні правамі) і пераносны характар (свабода перадачы ўладальнікам прадмета ўласнасці, напрыклад, продаж або дарэнне). Пейвіх адзначае яшчэ адзін фактар, які ўплывае на ўзровень рэфлексіі правоў уласнасці, – канстытуцыйную гарантыю ўласнасці, якая забяспечвае абарону ад умяшальніцтва дзяржавы ў распараджэнне прадметам уласнасці. На думку прадстаўнікоў тэорыі правоў уласнасці, суверэнітэт у распараджэнні дадзенымі дабротамі заўсёды абмежаваны (нельга, карыстаючыся сваімі дабротамі, наносіць шкоду іншым асобам, будынак узводзіцца на зямельным участку пасля атрымання дазволу адпаведных улад і г. д.). Гэта так званыя натуральныя абмежаванні.

Чым паўней правы ўласнасці (чым лепш яны сфармуляваны і чым лепш яны выконваюцца), тым мацней матывацыя ўладальніка да больш эфектыўнага выкарыстання наяўных даброт. І наадварот: чым слабей (больш абмежавана) уласнасць, тым менш эфектыўна выкарыстоўваюцца рэсурсы, якія складаюць яе прадмет. З аднаго боку, яны могуць быць празмерна выкарыстоўваемымі, а з другога – недаінвесціраванымі.

Аслабленне правоў уласнасці можа адбыцца ў выніку:

– дрэннага іх вызначэння (яны не прыпісаны канкрэтным асобам);

– цяжкасцей з прывядзеннем іх у выкананне або неналежнай іх абароны;

– абмежавання палітычнымі ўладамі.

О. Уільямс сцвярджае, што самым важным эканамічным пытаннем з'яўляецца юрыдычнае ўпарадкаванне правоў уласнасці. Калі гэта ўмова не выканана, толькі рынавы абмен правоў уласнасці ў адносінах да рэсурсаў можа гарантаваць перамяшчэнне гэтых рэсурсаў сярод юрыдычных асоб для найбольш эфектыўнага іх прымянення.

Згодна з тэорыяй правоў уласнасці, правы ўласнасці па ўзроўні паўнаты складаюць спектр ад поўных правоў (неабмежаваных) да вельмі абмежаваных паўнамоцтваў. Прыватная ўласнасць – гэта поўныя правы (выключныя і трансфертныя). На супрацьлеглым полюсе тэорыя правоў уласнасці размяшчае сумесную ўласнасць як неакрэсленую, гэта значыць не прыпісаную канкрэтным асобам. Паміж прыватнай уласнасцю і сумеснай уласнасцю знаходзіцца дзяржаўная ўласнасць, якая не мае аднназначнага характару – можа ў адных сітуацыях набліжацца да сумеснай уласнасці, а ў іншых – ад яе аддаляцца. Дзяржаўная ўласнасць можа быць арганізавана ў большай або меншай ступені. Аднак тэорыя правоў уласнасці адмоўна ацэньвае эфектыўнасць дзяржаўнай уласнасці з прычыны адсутнасці выключнасці і трансфертнасці правоў уласнасці асоб, якія здзяйснялі гэтыя правы.

Тэорыя правоў уласнасці выказваецца на карысць прыватнай уласнасці. Яна выступае супраць аслаблення правоў уласнасці празмерным умяшальніцтвам дзяржавы. Эгерстон піша, што кожнае змяненне ў вызначэнні правоў уласнасці мае даходныя эфекты ў выглядзе пераможцаў і пераможных. Такім чынам, нават нязначнае абмежаванне прыватных правоў уласнасці можа прывесці да макраэканамічных наступстваў [3, с. 40].

Правы ўласнасці маюць моцную сувязь з эканомікай кошту здзелкі (менавіта здзелкі ў новай інстытуцыянальнай эканоміцы з'яўляюцца асноўным элементам параўнальнага аналізу).

Ч. Эгерстон (1990) называе наступныя віды кошту здзелкі:

– выдаткі па пошуку інфармацыі (пра цэны і якасць тавараў, пра патэнцыяльных пакупнікоў і прадаўцоў);

– выдаткі на вядзенне перагавораў;

– выдаткі на афармленне кантракта і адсочванне другога боку кантракта з мэтай праверкі, ці прытрымліваецца ён умоў кантракта;

– выдаткі па прывядзенні кантракта ў выкананне і спагнанні пакрыцця страты, калі другі бок не выканае сваіх абавязацельстваў;

– выдаткі на абарону правоў уласнасці ад трэціх асоб.

Кошт здзелкі – гэта выдаткі на вызначэнне, прывядзенне ў выкананне і абарону правоў уласнасці. Паміж памерам кошту здзелкі і характарам правоў уласнасці існуе сувязь. Чым вышэй выдаткі на вызначэнне і прывядзенне ў выкананне правоў уласнасці, тым менш поўныя будуць правы ўласнасці. Тым самым чым хутчэй растуць выдаткі на вызначэнне і прывядзенне ў выкананне правоў уласнасці, тым хутчэй дасягаецца пункт, вышэй якога не ўдаецца ўмацоўваць правы ўласнасці.

Са строга эканамічнага пункту гледжання пытанне агенцтва з'яўляецца пытаннем аптымізуючым. Яно заключаецца на належным вызначэнні стымулаў (матэрыяльных заахвочванняў), якія схілялі б упаўнаважанага да дзеянняў, адпавядаючых чаканням даверніка, а таксама да падзелу рызыкі паміж агентам і яго начальнікам [10, с. 8].

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Праблематыка ўласнасці ў тэорыі агенцтва звязана з пытаннем карпаратыўнага нагляду, які ўзнікае ў сітуацыі аддзялення кіравання, здзяйсняемага менеджэрам, ад уласнасці, якая знаходзіцца ў руках знешніх інвестараў [6, с. 26]. Карпаратыўны нагляд – гэта пытанне агенцтва (пытанне пошуку аптымальнага кантракта) паміж менеджэрам і ўладальнікам. Перш за ўсё гаворка ідзе пра стварэнне праекта такога кантракта, які датычыцца сістэмы аплаты працы і які схіляў бы менеджэра да дзеянняў, адпавядаючых інтарэсам уладальніка. Калі б за дзеяннямі менеджэра можна было назіраць, вырашэнне пытання па кантракце, фарміруючага аплату працы, было б адносна простым. Кантракт дакладна вызначаў бы дзеянні, якія менеджэр павінен рэалізаваць, і належную яму за гэта ўзнагароду. Калі ж уладальнік не можа пастаянна назіраць за дзеяннямі менеджэра, то яны не могуць быць занесены ў кантракт і няма спосабу іх праверкі. Узнікае пытанне стварэння такога праекта сістэмы аплаты працы, які матываваў бы менеджэра прадпрымаць такія дзеянні, як у сітуацыі, калі за гэтымі дзеяннямі можна было б назіраць.

Такім чынам, форма кантрактаў залежыць ад наступных фактараў:

– ад таго, ці можна назіраць за дзеяннямі менеджэра;

– якая выбрана пазіцыя ў адносінах да рызыкі ўладальніка і менеджэра.

Асноўным прадметам зацікаўленасці тэорыі грамадскага выбару з'яўляецца сфера палітычных рашэнняў, фарміраванне грамадскага парадку і механізм прадастаўлення грамадскіх даброт [1; 9, с. 27].

Права ўласнасці тут вызначаецца як адно з асноўных правоў чалавека, сваю сілу дзеяння яно чэрпае з рашэння калектыву. Асобы, прымаючы ўдзел у грамадскіх рашэннях, вызначаюць свае правы, а таксама права ўласнасці. Асноўныя правы павінны ўтрымлівацца, на думку Дж. Б'юкенена, у Канстытуцыі, дзе вызначаюць канстытуцыйны выбар, гэта значыць правіла выбару рэгламенту жыцця калектываў людзей. Правы ўласнасці ў большай ступені павінны быць афармлены ў спецыяльных юрыдычных актах.

У кожным грамадстве правы ўласнасці адыгрываюць асноўную ролю. Калі правы ўласнасці ясна вызначаны і канкрэтна вядома, што каму належыць, то гэта аблягчае вядзенне перагавораў і заключэнне кантрактаў, памяншаецца рызыка ўзнікнення грамадскіх канфліктаў.

***Заключэнне.*** Новая інстытуцыянальная эканоміка прысвячае шмат месца праблематыцы ўласнасці. На падставе беглага агляду галоўных яе плыней можна зрабіць наступныя вывады:

1) прадстаўнікі новай інстытуцыянальнай эканомікі рашуча выказваюцца за прыватную ўласнасць;

2) выступаюць супраць аслаблення правоў уласнасці празмерным умяшальніцтвам дзяржавы, сцвярджаючы, што нават нязначнае іх абмежаванне можа прывесці да макраэканамічных наступстваў;

3) новая інстытуцыянальная эканоміка не адмаўляе дзяржаўнай уласнасці, але адмоўна ацэньвае яе эфектыўнасць;

4) асноўныя правы асобы (у прыватнасці таксама права прыватнай уласнасці) запісаны ў канстытуцыі, а іх абгрунтаваннем з'яўляецца грамадскі дагавор.


*Літаратура*

1. *Бьюкенен, Дж.* Сочинения. Серия: Нобелевские лауреаты по экономике / Дж. Бьюкенен. – М., 1997. – Т. 1.
2. *Buchanan, J.M.* Property as a Guarantor of Liberty. The Shaftes Gury Papers 1, E. Elgar, 1993.
3. *Eggerdson, T.* Economic Behavior and Institutions / T. Eggerdson. – Cambridge: Cambridge University Press, 1990.
4. *Hart, O.* Firms, Contracts and Financial Structure / O. Hart. – Oxford: Clarendon Press, 1995.
5. *Iwanek, M., Wilkin, J.* Instytucje i instytucjonalizm w ekonomii / M. Iwanek, J. Wilkin. – Warszawa: Uniwersytet Warszawaki, Wydzial Nauk Ekonomicznych, 1997.
6. *Kultys, J.* Natura firmy, problemy agencji i nadzor korporacyjny / J. Kultys // Wojtyna, A. (red.). Instytucjonalne problemy transformacji gospodarki w swietle teorii agencji / A. Wojtyna. – Krakow: Wydawnictwo AE w Krakowie, 2005.
7. *Pipes, R.* Wlasnosc a wolnosc, przekl / R. Pipes. – Warszawa: L. Niedzielski, Warszawskie Wydawnictwo Literackie, Muza SA, 2000.
8. *Williamson, O.* The New Institutional Economics: Taking Stock, Looping Ahead / O. Williamson // Journal of Economic Literature. – 2000. – № 3.
9. *Wilkin, J. (red.).* Teoria wyboru publicznego. Wstep do ekonomicznej analizy polityki i funkcjonowania sfery publicznej / J. Wilkin (red.). – Warszawa: Wydawnictwo Naukowe Scholar, 2005.
10. *Wojtyna, A. (red.).* Instytucjonalne problemy transformacji gospodarki w swietle teorii agencji / A. Wojtyna (red.). – Krakow: Wydawnictwo AE w Krakowie, 2005.



*Summary*

*The article presents approaches to ownership issues in the mainstream of new institutional economics. Special attention is focused on the first, fully developed school of new institutional economics – Property Rights Theory. The study also points out the role of ownership in Transaction Costs Economics, Agency Theory and Public Choice Theory.*


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ